для яе далейшай граматычнай распрацоўкі, удасканалення ўласцівых ёй структурных элементаў.

1 Бергман, А. // Слова пра Браніслава Тарашкевіча. – Мн.: Мастацкая літаратура, 1996. – 192 с.
2 Клейн, Б. // Старонкі слаўнага жыцця. – "Полымя", 1963 – №10. – с. 14.

УДК 94(476)

# ГІСТАРЫЧНЫЯ ПОМНІКІ БЕЛАРУСІ (ВІЦЕБСКАЯ ВОБЛАСЦЬ)

*Студэнт – Рабчанка М. А., 4 мот, 2 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Фокіна І.С., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Распавядаць пра незвычайныя куткі Беларусі можна бясконца, бо немагчыма абмінуць і слаўныя гістарычныя мясціны, і велічныя архітэктурныя помнікі, і прыродныя багацці, і шэраг іншых матэрыяльных і духоўных здабыткаў прашчураў і сучаснікаў. А калі паварушыць зжаўцелыя старонкі гісторыі нашага краю, то колькі яшчэ ўсяго невядомага і таямнічага можна знайсці! Самыя цікавыя мясціны Беларусі – таямнічыя замкі і радавыя сядзібы, цудоўныя храмы і манастыры, унікальныя куткі некранутай прыроды, старадаўнія інжынерныя збудаванні, цікавыя музеі і этнаграфічныя вёскі, родныя мясціны знакамітых мастакоў, пісьменнікаў і вучоных...

Пэўна ж, у кожнага ёсць свой уласны «спіс» цудоўных месцаў і рэліквій. Для мяне гэта мая родная Віцебшчына. ці не сапраўдны гэта цуд – жыць на зямлі, такой багатай на славутасці? Легендарны край блакітных азёр, старажытных гарадоў і старадаўніх помнікаў, які даў свету такія імёны, як Ефрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Марк Шагал, Іван Чэрскі, Леў Выгоцкі... Менавіта на віцебскай зямлі сусветна вядомы авангардыст Казімір Малевіч напісаў галоўную працу аб супрэматызме, а таленавіты жывапісец Ілья Рэпін стварыў амаль 40 карцін і малюнкаў. Унікальныя

прыродныя жамчужыны Віцебшчыны – нацыянальны парк «Браслаўскія азёры», якія славіцца сотнямі маляўнічых азёр і астравоў, ландшафтны заказнік «Ельня», дзе знаходзіцца адзін з самых вялікіх у Еўропе масіваў старадаўніх вярховых балот і ледавіковых азёр.



**Валун-ахвярнік у вёсцы Двор-Таранковічы**

Гэта не проста камень – гэта вялізны камень-ахвярнік. Каб уявіць яго памеры, неабходна прадставіць 20 чалавек, якія стаяць шчыльна адзін да аднаго.

Ахвярнікам камень называецца з-за таго, што пасярэдзіне маецца паглыбленне, якое па павер'ях магло служыць своеасаблівым прыстасаваннем для ахвяравання. У асобную ямку апускалі каштоўнасці, упрыгожанні, манеты, якія, па словах відавочцаў, захаваліся там і сёння. Ад вялікай адтуліны да бакоў разыходзяцца канаўкі. Менавіта па гэтых канаўках сцякала кроў жывёл, прынесеных у ахвяру нашымі продкамі. Канаўкі досыць правільнай формы, хоць доказаў дакранальнасці да іх рукі чалавека няма, таму, верагодна, што канаўкі нейкім магічным чынам зроблены прыродай.



**Касцёл Святой Варвары ў Віцебску**

Касцёл Святой Варвары ў Віцебску быў пабудаваны ў 1785 годзе на сродкі маршалака Антонія Косава. Асвечаны ён быў у імя святой пакутніцы Варвары, заступніцы ад імгненнай смерці, якая лічыцца нядобрай ў хрысціянстве. Асвячаў храм магілёўскі арцыбіскуп Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч. У 1800 годзе каля касцёла на сродкі харунжага Пятра Ліозко была пабудавана яшчэ і капліца Святога Крыжа. Касцёл Святой Варвары ў Віцебску ў тыя часы часта называлі Падвіцябскім, так як ён знаходзіўся за мяжой горада. Касцёл Святой Варвары ў Віцебску з'яўляецца аб'ектам пазнавальнага і рэлігійнага турызму ў Беларусі. Пасля наведвання гэтага касцёла, вы яшчэ доўга будзеце знаходзіцца пад уражаннем ад яго велічнасці і прыгажосці!



**Помнік князю Усяславу Чарадзею ў Полацку**

У горадзе Полацк, на скрыжаванні вуліц Кастрычніцкай і Еўфрасінні Полацкай, была ўстаноўлена першая конная статуя ў Беларусі. 1 верасня 2007 года адбылося ўрачыстае адкрыццё

помніка. Аўтарам бронзавай статуі стаў мінскі скульптар Аляксандр Прохараў, а галоўным героем мастацкай кампазіцыі – легендарны князь Усяслаў Чарадзей. Наймудрэйшы кіраўнік, які падняў зямлю Полацкую на вяршыню велічы і славы, заўсёды ўяўляўся фігурай таямнічай і містычнай.

**Дом-музей Марка Шагала ў Віцебску**

Дом-музей Марка Шагала ў Віцебску з'яўляецца часткай музейнага комплексу, прысвечанага Марку Шагалу, аднаму з найвялікшых прадстаўнікоў мастацкага авангарда 20 стагоддзя. Музейны комплекс акрамя дома-музея Марка Шагала ў Віцебску ўключае ў сябе таксама Арт-цэнтр Марка Шагала ў Віцебску. Гэты комплекс – адзін з двух мемарыяльных музеяў Марка Шагала ў свеце! Другі размяшчаецца ў французскай Ніцы і называецца Нацыянальны музей біблейскага паслання Марка Шагала. Дом-музей Марка Шагала ў Віцебску адкрыты 6 ліпеня 1997 годзе, да 110-годдзя з дня нараджэння мастака.



**Помнік Уладзіміру Караткевічу ў Оршы**

«Орша – мой любы горад, мая спрадвечная маці...» так Уладзімір Караткевіч казаў пра месца, дзе нарадзіўся і вырас. Сёння любімы горад адказвае вядомаму беларускаму пісьменніку ўзаемнасцю: тут не толькі ганарацца, яго творчай спадчынай, але і беражліва захоўваюць кожнае сведчанне яго жыцця. Помнік Караткевічу з'яўляецца адной з цэнтральных славутасцяў,

уключанай практычна ва ўсе экскурсійныя праграмы па Оршы. Аўтарам бюста стаў Ігар Голубеў, беларускі майстар і мастак, які працаваў над вядомымі скульптурамі Язэпа Драздовіча (Траецкае прадмесце) і Сымона Буднага (дворык Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта) ў Мінску.Урачыстае адкрыццё помніка адбылося яшчэ ў 1992 годзе, і было прымеркавана да юбілею горада.



1 Каханоўскі, Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI – XIX стст. – Мн: Навука і тэхніка, 1984.
2 Мысліцелі і асветнікі Беларусі: Энцыкл. даведнік. – Мн.: БелЭн., 1995.
3 Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. – Мн.: БелЭН, 1993.

УДК 811.161.3

## ШТО Ў ПРОЗВІШЧЫ ТВАІМ?.. (ПРА ПАХОДЖАННЕ І ЎТВАРЭННЕ ПРОЗВІШЧАЎ)

*Студэнт – Альфяровіч М.А., 4 мот, 2 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Фокіна І.С., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

З самага ранняга часу, як толькі прозвішчы пачалі выкарыстоўвацца ў грамадстве, назіралася нараджэнне зацікаўленасці да іх паходжання. З'яўляліся асобы, якія былі